*Вячаслаў Красулін*

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ ЭТНАФОНІІ ВА ЎМОВАХ ФАЛЬКЛОРНАГА РУХУ БЕЛАРУСІ Ў ХХІ СТАГОДДЗІ

Да каранёвай інструментальнай этнафоніі беларусаў даследчыкі адносяць: т.зв. «дударскую музыку», «смыковую музыку», «траістую музыку». У розных выглядах усё яны даіснавалі да нашага часу. Асяродкі іх існавання складаліся з аўтэнтычных музыкаў, паколькі акадэмізаваным «народнікам» каранёвыя этнафанічныя ўзоры збольшага дагэтуль не цікавыя. У этнафанічную партытуру, якая пабудавана на падставе поліфаніі і манодыі амаль «эмбіентна» ўвадзіліся гукі і шумы танцаў, прыгукі і выклікі музыкаў і слухачоў, побытавыя шумы. Рафінаванне традыцыі ў італа-немецкім стылі значна збядніла эстэтыку і эмацыйны ўплыў каранёвай музыкі беларусаў, а назбаўленне генетычна ўласцівых традыцыі мадэляў пераемнасці і існавання амаль выціснулі яе з жыцця і ментальнага поля народа.

Сёння, пасля 30-гадовага забыцця і наступнай 30-гадовай рэвіталізацыі дуды - каранёвага музычнага інструмента беларусаў - дударскі музычны рэпертуар з'яўляецца найбольш разнастайным і запатрабаваным у адпраўленні каляндарных свят (што, безумоўна, сведчыць аб вялікім узросце дударскай традыцыі), падчас сямейна-побытавых свят, вячорак і бясед. У традыцыі выканаўцы на дудзе маглі выконваць твор як сольна, так і ў капэлі, куды звычайна ўваходзілі скрыпка і барабан ці бубен [1, 241]. Як адзначалі этнографы XIX ст., дудары - неад'емныя ўдзельнікі значных фальклорных падзей. Як зазначаў П.Шпілеўскі, «пры партыі валачобнікаў заўсёды маецца музыкант, а часам і два, адзін са скрыпкай, другі з так званай дудой» [3]. Некаторыя сучасныя даследчыкі лічаць, што ў гукарадзе дуды адсутнічаў мінорны лад, але нельга вылучыць агульны гукарад для арэалу існавання традыцыі ігры на дудзе. Археалагічныя знаходкі Л.У.Калядзінскага ў Віцебску сведчаць, што дуда бытавала на Беларусі ўжо ў XIII ст. [2, 150]. У сяр. XIX-пач.XX ст. інструмент выціскаецца з побыту з-за распаўсюджвання гармоніку. Традыцыя дударства амаль знікла у 1950-1960-я гг. Але дзякуючы намаганням майстроў музычных інструментаў Ул.Пузыні, Ул.Грома, В.Кульпіна, А.Лася, Т.Кашкурэвіча дуду вярнулі «да жыцця». У XXI ст. з'яўляюцца новыя майстры і музыкі-дудары, якія спрыяюць адраджэнню дударскай традыцыі на Беларусі.


Малюнак 1 – Зачынальнік і скрыпак валачобнай падзвінскай дружыны, 1970-я гг. (паводле З.Мажэйка)

Смыковая музыка мела шырокі распаўсюд у асноўным у Заходняй і Паўночнай Беларусі, але зараз пачуць, каб гралі разам на скрыпцы і басэтлі вельмі цяжка, а яшчэ і з альтэрняй - амаль проста немагчыма. Традыцыйную капэлю замянілі розныя варыянты «аркестраў і ансамбляў».

Траістая музыка існуе і зараз і часцяком гучыць на вяселлях, вячорках, фестывальных і конкурсных сцэнах Беларусі, але кола яе прыхільнікаў мае тэндэнцыю да звужэння. Усё тэта напачатку XXI ст. вымагала пошуку мадэляў пераймання каранёвай этнафоніі, цікавых і запатрабаваных новымі пакаленнямі беларусаў, актуалізацыя чаго і адбылася ў мілеpopulum.

Калі прааналізаваць досвед укаранення мастацтва вуснай традыцыі ў побыт урбанізаваных асяродкаў Беларусі XX-XXI стст., то асноўнымі мадэлямі пераемнасці танцавальна-гульнявой этнафоніі ва ўрбаністычных умовах сталі *спантанна наладжаныя народным святы*, *этнадыскатэкі*, *пленэрныя танцавальныя імпрэзы*, часткова - *фестывальныя* і *акадэмічна-справаздачныя імпрэзы*.

Спантанна наладжаныя народныя святы - адпраўленні каляндарных абрадаў, наладжаныя без афіцыйнай рэгламентацыі ўладаў і дзяржаўных устаноў аматарамі фальклору з урбаністычных асяродкаў. Узніклі напрыканцы XX стагоддзя ў культурных асяродках гарадской мінскай моладзі «Майстроўня» і «Талака». Такія святы звычайна плануюцца і ініцыіруюцца спантаннымі лідэрамі - знаўцамі і аматарамі фальклору, знаходзяць падтрымку сярод іх аднадумцаў і наладжваюцца ці з выездам у натуральныя асяродкі бытавання фальклору (на вёску, у прыгарад), ці ў спецыяльна прыстасаваныя для святкавання месцы (музей-скансэн у в. Азярцо, музяей Я.Купалы ў Вязынцы). Традыцыя правядзення такіх імпрэз існуе ў Мінску дагэтуль і мае тэндэнцыю да пашырэння, запазычвання іншымі рэгіёнамі. Колькасць іх удзельнікаў розніцца ў залежнасці ад ступені грамадскай актыўнасці і арганізатарскіх здольнасцяў іх спантанных арганізатараў. Да прыкладу, колькасць задзейнічаных у святкаванні Купалля 2008 года ў Ракаве Валожынскага раёна дасягала 250 - 300 чалавек (арганізатары - удзельнікі гурта «Вянок» п/к Лізаветы Пятроўскай і гурт «Этнасуполка» п/к Тацццяны Пладуновай), а праз некалькі дзён на Купалле ў в. Вязынка сабралася 24 чалавекі (арганізатар - знаўца побытавага танца Ілля Арыстаў). Розніца ў колькасці ўдзельнікаў не замінала ў абодвух выпадках спантаннасці і адчуванню свята. Шмат у чым гэты настрой быў забяспечаны найгрышамі да гульняў і побытавых танцаў на скрыпцы, дудзе, бубне з калатушкай, якія выконвалі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

музыкі гурта «Ветах» Алесь Масібут, Вячаслаў Калацэй, Павел Ляшок. Традыцыя выкарыстання інструментаў каранёвай этнафоніі беларусаў звязана з постфальклорным купальскім рэпертуарам, дзе ў гульнёвай частцы пераважаюць гульні, тэксты да якіх змяшчаліся, напрыклад, Паўлам Шэйнам у раздзеле «песні плясавыя і дударскія» - «Былі ў бацькі тры сыны», «Я цяцерку пасу». Ад экс-удзельнікаў «Талакі» (асабліва ад Іллі Арыстава) аматары правядзення народных свят XXI стагоддзя пераняли танцавальныя гульні «Юрачка», «Шастак», «Явар», «А ў месяцы верасні», «Шуляк», якія штогод ладзяцца на Маслянку, Юр'я, Купалле, Каляды ў розных месцах Беларусі.

Этнадыскатэкі - танцавальныя вечарыны ў клубах, дзе развучваліся побытавыя танцы. Узніклі ў пачатку XXI стагоддзя з спантанных студэнцкіх вечарын мінскай моладзі. Ідэал рэканструкцыі «беларускай карчмы» быў адпачатку шчыльна звязаны са сферай паслуг і рэстараннага бізнесу. Акрамя музыкаў тут была неабходна дапамога з боку ўладальнікаў клубаў, кафэ, рэстарацый. Яны забяспечвалі «карчомную» інфраструктуру - інтэр'ер, напоі, асвятленне, абслугоўванне і г.д. Першая з этнадыскатэк - «Па-ва-да» (арганізатары - гурт беларускай музыкі «Ветах» п/к Вячаслава Калацэя) адбылася 28 сакавіка 2001 года ў мінскім клубе «Тунэль» [4]. Адпачатку яны былі зарыентаваны на каранёвую інструментальную музыку беларусаў - побытавы танец, дударскую, смыковую, траістую музыку. Паступова ў этнафанічны рад постфальклорных гуртоў былі «прасунуты» найгрышы на гуслях, рэканструкцыі еўрапейскай (нямецкай, ірландскай) сярэднявечнай музыкі. За некалькі год існавання гэта форма злучалася як з экатурыстычна-камерцыйнымі праектамі («Ліцьвіны» п/к Уладзя Бярберава, «Рада» п/к Васіля Грыня), з эстрадна-эксперыментальнымі («Стары Ольса» п/к Зміцера Сасноўскага, «Cornucopia» п/к Ягора Касцючэнкі, «Testamentum Terrae» п/к Юрася Панкевіча) і этнакультурна- выхаваўчымі («сямейная» этнадыскатэка ў кафэ «Жар-птушка» суполкі Іллі Арыстава). Этнадыскатэкі збіраюць ад 50-40 да 200-400 чалавек удзельнікаў і з'яўляюцца камерцыйна рэнтабельнымі - кошт квіткоў у 2010 го дзе даходзіць ад 7000 да 20000 беларускіх рублёў. Зараз пашыраецца кола гуртоў разнастайных стылявых плынь, якія выкарыстоўваюць дуду як дзеля эксперыменту ў гучанні («Юр'я», «Neuro Dubel», «Vicious Crusade», «Ляпіс Трубяцкой»), так і як неад'емны інструмент («Znich», «Litvintroll», «Кашлаты Box»). На мой погляд, такое выкарыстанне дуды мае як пазітыўныя, так і негатыўныя аспекты: дуда ў іх звычайна губляе этнафанічную асаблівасць, але слухачы, не далучаныя да традыцыі набываюць пэўную цікаўнасць да самога інструмента і пачынаюць цікавіцца яго гісторыяй, што прыводзіць іх да традыцыйнай дударскай музыкі.


Малюнак 2 – Капэля пастухоўскіх труб беларуска-літоўскага памежжа (фота пач. XX ст.)

Пленэрныя танцавальныя імпрэзы - спантанна склаліся ў працэсе перанясення ў побыт гораду ведаў, уменняў і навыкаў, якія набылі гараджане пры наведванні гарадской моладзю народных свят, ці іх рэканструкцый, зробленых фальклярыстамі. Яны сталі крыніцай творчай самарэалізацыі маладых музыкаў (пераважна выканаўцаў на дудзе), якія не былі запатрабаваны афіцыйнай культурай. Такія імпрэзы ў добрае надвор'е ў 2008 - 2010 гадах штотыднёва адбываліся ў Мінску ля будынку Нацыянальнай бібліятэкі. Гралі пераважна чальцы мінскага «Дударскага клубу» (ля вытокаў яго ў 2007 годзе стаялі Тодар Кашкурэвіч, Зміцер Сасноўскі, Алесь Лось, Юрась Панкевіч, Дзяніс Сухі і інш. [5]). Акрамя беларускай дуды там гучаць нямецкія дудальзакі і галісійскія гайды, розныя віды ўдарных інструментаў. На імпрэзы збіралася пераважна моладзь з рэканструктарскіх («рыцарскіх») асяродкаў у колькасці ад 40 да 300 чалавек.

На мяжы Цэнтральнай Беларусі і Усходняга Палесся ў Любанскім раёне Мінскай вобласці рэгулярна «на пленэры» праводзіцца імпрэза «Танцы пад гармонік». Наладжвае яе лідэр калектыва «Верабейкі» Сяргей Выскварка, супрацоўнік Любанскага цэнтра культуры і, адначасова, аспірант Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі. У час імпрэзы ў г.п. Любань Мінскай вобласці гучаць найгрышы да мясцовых побытавых танцаў, якія выконваюць музыкі-гарманісты і выканаўцы на бубне з калатушкай. Сярод танцаў - «Матлёт», «Гапачок», «Субота», «Каробачка», «Какетка», «Васадулі», «Лысы», «Ночка», «Лявоніха», якія вядомы ў розных рэгіёнах Беларусі, так і характэрныя толькі для мясцовай лакальнай культуры - «Шаміль», «Варяг». Удзельнікі дзіцячых фальклорных гуртоў з Любанскага раёна (сёння гэта «Званочкі» - Забалацкі СДК, «Арашок» - Камунараўскі СДК, «Верасок» - Тальскі СДК, «Топчык» - Обчынскі СДК, «Русалінка» - Загальскі СДК, «Расічка» - Сароцкі СДК, «Трататуха» - Обчынскі СДК, «Жэўжык» - Любанскі РЦК) спаборнічаюць на лепшае выкананне мясцовых танцаў і гульняў. На спаборніцтвы-хэпенінгі былі заяўлены 6 намінацый (Парна-гуртавыя танцы, Шматкаленныя танцы, Сольны імправізацыйны танец у масавым выкананні, Традыцыйныя карагоды, Танцы тройкамі, Парныя танцы «Шэсць з дванаццаці»), кожная з якіх утрымлівала па 8 танцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў сумесна з супрацоўнікамі лабараторыі фальклору Нацыянальнага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі ў Дзіцячым цэнтральным парку імя М. Горкага (май 2007 года) былі наладжаны «Зялёныя святкі», якія канцэптуальна планаваліся як наладжаныя «на пленэры». Удзел у свяце прымалі розныя фальклорныя калектывы г. Мінска, а таксама і госці з суседняй Літвы - фальклорны калектыў «Meguva» з Палангі. У першай - умоўна кажучы, «рытуальнай» частцы, маладыя дзяўчаты абвязвалі дрэвы стужкамі, што павінна было сімвалізаваць сабой дзявочую ініцыяцыю і кумленне. Пераважна гучала смыковая і дударская музыка. Пасля абрадавага дзеяння на вялікай пляцоўцы, дзе праходзіла дыскатэка, так званая «Танцы на палянцы», сабралося шмат моладзі, як удзельнікі свята, так і выпадковыя наведвальнікі парку.

Некаторыя фестывальныя і акадэмічна-справаздачныя імпрэзы ў XXI стагоддзі таксама сталі праводзіць як з'явы, невыдзеленыя з побытавых сітуацый. Такім чынам афіцыйныя мерапрыемствы галіны культуры паступова запазычылі вопыт нефармальных асяродкаў. І паступова спантаннасць і новыя формы мерапрыемстваў сталі ўстаўляцца ў афіцыйны фестывальны рух (святкаванне Купалля на Рэспубліканскім фестывалі «Берагіня» ў 2008 і 2010 гадах у г.п. Акцябрскі, што на Усходнім Палессі) і акадэмічна-справаздачныя формы (практычная частка экзамену па спецпрадмеце ў форме абраду Пахаванне стралы трэцціга выпуску Этнафоназнаўства ў Ветцы (Усходняе Палессе) ў 2010г.).

Варта адзначыць, што пераемнасць інструментальнай этнафоніі на Беларусі павялічваецца зараз у гарадскім асяродку, у той час як на вёсцы застаецца ўсё меньш музыкаў, валодаючых асаблівасцямі ігры на народных інструментах.



*Малюнак 3* – Дуды беларуска-літоўскага сумежжа, кан. XIXст. Фонд Lietuvos Nacionalinis Muzejus (Вільнюс), фота В.Калацэя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Спіс літаратуры:**


1. Без-Корнилович, М.О. Историческия сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с присовокуплением и других сведений к ней же относящихся / М.О. Без-Корнилович. - СПб., 1855 - 355с.
2. Назіна, І.Д. Беларускія музычныя інструменты / І.Д.Назіна. - Мінск: Беларусь, 1997. - 239 с. : іл.
3. Шпилевский, П. Русский дневник / П. Шпилевский. - СПб., 1859. -№ 101.-210 с.
4. Сайт гурта беларускай дударскай музыкі «Ветах» [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступа: http://vietah.narod.ru. - Дата доступа : 10.04.11.
5. Сайт беларускай дударскага клуба [Электронны рэсурс]. - Рэжым доступа: http://dudar.info. - Дата доступа: 10.04.11.